Цана асобнаго № 40 кап.

ВОЛЬНАЯ БЕЛАРУСЬ

ТЫДНЁВІК палітычны і літэратурны

Ніхай жыве незалежная Беларусь!

УМОВЫ ПАДПІСКІ:
На год . . 12 р. —
На паўгода . 7 р. —
На 1 месяц . 1 р. 50 к.

Перамена адрасу 50 к..

Адрас рэдакцыі і адміністрацыі:
г. Менск, Захараўская, 18.

ГОД ВЫДАННЯ II.

№ 36. 20-го кастрычніка 1918 г. № 36.

Рэдакцыя „Вольнае Беларусі" просіць усіх сваіх падпішчыкаў, якія хочуць адтрымліваць тыднёвік праз почту, прысляць свой пачтовы адрас і дадатковых 1 руб. у месяц за перасылку.

Сьлёзы.

Мазгі застываюць ад думак аб сьвеце,
На сэрцы—як камень ляжыць,
Бо шчасьце ня скора народу засьвеце
І прыдзецца доўга тужыць!
Вядома, што смутак ані не паможа,—
Ад сьлёз нам які супакой?
Сьпяваў-бы вясёлую песьню я можа,
Дык дзе там да песьні такой!..

Настрою я струны і песьню складаю,
Дык мысьлі, як цень, уцяклі,
І, покуль на струны свае паглядаю,
Вось сьлёзы з вачэй пацяклі...
І цяжкія, горкія сьлёзы такія,
Што камень маглі-б прапаліць!
А што за карысьць, калі беды людзкія
І морам тых сьлёз не заліць?!

З. Вехаць.

Курганы.

Тагды во, як лінню акопаў капалі
І блуталі з дротаў калючых шнуры,
На могільнік некі якраз мы папалі,
Чапілі курганы даўнейшай пары...
Дасталі людзкія струхлеўшыя косьці,
Іржавае стрэмя і крыж ад мяча
І некае-нешта, жалезнае штосьці,—
Аднесьлі у двор да свайго паніча.
Студэнт,—наш паніч,—ён сказаў, што служылі
Калісьці вось шведу і стрэмя і меч,—
Бо шведы свае тут галоўкі зложылі,—
А трэцяя будзе французская рэч.
І ёсьцека гэта замок пісталета
Француза, каторы з Масквы уцякаў,
Бо край наш заўсёды з далёкага сьвету
Ня раз у сябе, як братоў, спатыкаў.
І шчыра спаткаўшы, як добраго госьця,
Даваў адпачынак з далёкай пуці,
А ён, небарака, прастаючы косьці,
З зямлі беларускай ня мог адысьці...
Бо мяккая вельмі пасьцель у балоце,
У жоўтым пясочку, дзе хвоя ды ель;
Падушачку з белаго сьнегу калоце,
Выводзячы песьню, крутуха-мяцель.
Улетку мацней, як зімой, яму сьпіцца,
Бо зелена, міла і цёпла кругом;
І летам, у кветках, часьцей-жа прысьніцца
І край яму родны і кінуты дом.
Адкуль ён, прабуючы лепшаго лёсу,
Пусьціўся на зьведы па шчасьце у сьвет,
Аж покуль, дастаўшы ад некаго чосу,
Дарогай ня страціў да хаты свой сьлед.
Зблудзіўшы, нарэсьце, да пушч Беларусі
І зьведаўшы край, дзе жыве беларус,
Ен тут зажадаў, замарыўшыся, мусі,
Навекі зрабіць з намі дружны хаўрус
І тут адпачыць вось, у нашай старонцы,
Бо ціха, спакойна у нашых лясох,
Хоць мевей, быць можа, сагрэе тут слонцо,
Як дома, адкуль ён прыблытацца мог...
Паніч так тлумачыў, і вось яго мова
Збылася цяпер ужо на вачах,
Збылося ад слова усё і да слова,—
Аж жутка і некі бярэ цябе страх!
Бо там, дзе акопы капаць нас ганялі,
Дзе дротаў калючых мы лінню вялі,—
Зноў новых курганаў там горы узьнялі,
Падняўшы знарадамі глыбы зямлі.
І тамака новыя добрыя госьці
Знайшлі адпачынак з далёкай пуці,
У жоўтым жвірочку прастаючы косьці,
Ня могуць так сама яны адыйсьці...
Там, там—дзе бок-во-бак даўно спачывалі
Ад рознаго часу і швэд і француз,—
Як з Рэйну, так з Волгі ваякаў схавалі
На віве адвечнай тваёй, беларус.
Няхай спачываюць, бо сьмерць паяднала,
І болей ня пойдзе на брата ды брат!
Зямлі людзям стане, ня будзе замала,
Як побач кладуцца, па-брацку, урад...

21 6—1918.
Нежыцы.

Захар Вехаць.



Нашы месты.

Ваколіцы Вільні

«Беларусь,—кажа Адам Кіркор,—край могліц, курганоў, гарадзішч, гарадкоў, урочышч, замкаў і замчышч,—край, дзе чуўць не на кожным кроку спатыкаюцца сьляды прамінулаго ў помніках, паданнях і песьнях». Тое самае кажа і вядомы польскі і беларускі паэта У. Сыракомля, што на Беларусі кожная пядзь зямлі крые ў сабе сьляды гістарычных здарэнняў. Узгорак, ці груда руінаў, крыж пры дарозе, слуп, ці капліца, або нават карчма, з стадолай пры ёй, — усё тут зьяўляецца гістарычным помнікам старажытных часоў. Так многа цікаваго пазаховано скрозь па абшарах зямлі Беларускай!

Вось недалёка ад Вільні стаіць невялічкая вёска Кернаў. Гэта — найдаўнейшая сталіца беларуска-літоўскаго гаспадарства, пабудованая баечным князем Кернусам у 1040 г., як сьведчаць летапісы, а напэўна, далёка раней. „Княжа Кунас, — кажа кровіка Быхаўца, — меў двух сыноў: аднаго Кернуса, а другога Гімбута. А пануючы яму ў зямлі Жмаідзкай, пачаў множыці і расшыраці і выхадзіці за рэку Велію, у зямлю Завельскую; і прашэд рэку Сьвятую вышэй, і нашоў мейсцо вельмі хароша. І спадабалося яму тое мейсцо вельмі, і ён там пасяліў сына сваяго Кернуса і назваў тое мейсцо па Кернусе *Кернавам*".

Каля 1230 г. князь Рынгольд перанёс сталіцу з Кернава ў Навагрудак, але Кернаў яшчэ надоўга захаваў сваё значэнне, як старэйшая сталіца.

К ліку даўнейшых, старажытных паселкаў прыналежаць *Меднікі*, з прыгожым некалі замкам, на каторы ня раз рабілі аблогу рыцары. Тут, сярод адвечных пушчаў, была летняя рэзыдэнцыя князёў беларуска-літоўскіх. Тут любіў палявацы вялікі князь Альгерд, жывучы у замку доўгі час з княгіняю Вульянаю. Цяперашняя Вострая Брама ў Вільне даўней звалася Медніцкай, дзеля таго, што сюдою езьдзілі у Меднікі. Руіны Медніцкаго замку захаваліся і да нашаго часу і складаюцца в чатырохкантовай сьцяны, —16 арш. у вышыню, 195 у шырыню і 249 арш. у даўжыню. У 1655 г. замак быў зруйнованы расійцамі, хоць і раней ужо быў паталочан.

Троцкі павет самы багаты на свaім гістарычным памяткам. Істнуюць двое Трокаў: Старыя Трокі і Новыя Трокі. Старыя Трокі, або Гругалі, старавечны пасёлак. Думаюць, што тут была сталіца удзельных князёў яшчэ у X веку. Цяпер гэта невялічкае мястэчко.

Новыя Трокі пабудаваны Ге... Тут, да перасялення у Вільню ...

Дзяржаўная бібліятэка ..ССР імя У. І. ...

лікакняжацкая сталіца. Трокі—гэта атока (паувостраў), бо з трох бакоў абкружацы вазёрамі Гальва і Спайсьце, і толькі з боку віленскай дарогі застаецца невялічкі суток, злучаючы гэтую атоку з матэрыкам. На беразе возера Гедымін пабудаваў замак, руіны катораго захаваліся да нашаго часу. Добра захаваліся дзьве вежы і частка сьцяны. Існуе нават і увойсьце ў лёх.

Але славу Трокаў складаюць руіны другога вялізорнаго готыцкаго замку, пабудованаго на востраве, сярод возера Гальва. Замак сваімі сьценамі займаў увесь востраў, каля 2-х дзесяцін зямлі. Падвойная каменная сьцяна абкружала ўсю плошчу вострава, маючы на выпятых канчатках тры готыцкія вежы. Самы замак у кшталце паралелограма пабудованы быў у два паверхі, з высокаю вартовою вежаю, узьнятаю над самым замкам. Малюнкі, якія бачылі там яшчэ нядаўна, былі у стылю візантыйскім.

Колькі успамінкаў зьвязано з руінамі троцкага замку! Тут жыў храбры і добры Кейстут з сваёю красуняю Бірутай, аб жаніцьбе з каторай беларускія кронікі апавядаюць гэтак: «І пануючы Кестуцю на Троцах і на Жамаіці, услышаў дзеўку на Палондзе, імянем Біруту, каторая дзеўка багом сваім, подлуг абычаю паганскаго, пашлюбіла чыстасьць хаваці, і сама была хвалена ад людзей за багіню. І прыехаў князь Кейстуцей сам, і спадабалася вялікаму князю дзеўка, іж была вельмі красна і разумна; і прасіў яе, абы яму была малжонкаю. І яна не хацела зволіці і адказала яму, іж я пашлюбіла багом сваім чыстасьць хаваць да жывата сваяго. І князь Кейстуці узяў яе моцне з таго места і прывадзіў яе да стольца сваяго у вялікай пачэснасьці да Трокаў. І абасдаўшы брацію сваю, і учыніў вялікае вяселле з браціею сваею. І паняў тую панну Біруту сабе за жану».

Тут, 30-го кастрычніка 1430 г., памёр найвялікшы з князёў беларуска-літоўскіх, Вітаўт; тут 20-го марца 1440 г. кн. Чартарыскі, Даўгерд і Лелюш забілі Зыгмунда Кейстутавіча, брата Вітаўтаваго. Аб гэтай жудаснай гісторыі кроніка Быхаўца апавядае ў гэтакіх словах:

«Пануючы вялікаму князю Зыгімонту на Вільні і на Троцах і на усіх Рускіх, і Літоўскіх, і Жамайдзкіх землях, і сільныя акрутэнствы чыніў подданым сваім, а злашча над ражаем шляхецкім: няміласьціве іх імаў і цяжкія акрутэнствы над німі чыніў, нявінне іх караў і мардэрствы над німі чыніў якія вымысьліці могл, над усімі княжэты і панеты і ражаем шляхецкім усіх земль—Літоўскіх, Рускіх і Жамайдзкіх; і быў таму ражаю шляхецкаму вельмі акрутны, і усімі учынкі сваімі злымі прыраўнаны ест ка Антыоху Сырскаму і Іроду Ерусалімскаму і к продку сваяму, вялікаму князю Літоўскаму, Тройдану, каторы сідьныя акрутэнствы чыніў над землямі Ляцкімі і Рускімі. І тыя подданыя яго усэ шляхта таму цярпелі, як верныя рабы пану сваяму, і нічога злога яму ня чынілі ані мысьлілі. І он-жа, акалнік князь вялікі Зыгімонт, не пасыціўся злосьці сваёй і мысьлiў у сэрцы сваём на дзьяволу навучэнне, кака-бы увесь ражай шляхецкі загубіці і кроў іх разьліці, а наднесьці ражай хлопскі, цею кроў. І напярвей сваіх блізкіх і прыражоных двух князёў паймаў, хоцячы а горло прыправіці,—напярвей князя Юрыя Лынгвяневіча а князя Алельку Валадымiравіча. І пасадзіў князя Юрыя Лынгвяневіча ў меньшым замку Троцкім, а князя Алельку у Кернаве, а княгіню яго з двама сыны, з Сямёнам і з Міхайлам ў Уцяне; і яшчэ на том мало маючы і на астатак раду і умысл свой злы на том заставіў: сэйм вялікі учыніці, а на том сэйме ўсю шляхту высьцінаці і выкараніці, а хлопскі ражай паднесьці. І пішат граматы акаяннік па усім землям сваім, уластам вялікаго князства княжатам і панятам і ўсёй шляхце, прыказуючы, абы ўсе на сэйм ехалі, паведаючы прычыну рэчы—земскае, а злосьць сваю утаіў, што праціўку іх умысьліў. А тот час быў ваяводаю віленскім Даўгерд, а ваяводаю троцкім Лелюш; і тыя два паны, даведаўшыся даставерна, яка тот сэйм паложан на пагубу ўсёго ражаю шляхецкаго і іх самых,—і вазвалі к сабе у раду князя Чартарыскаго; і тыя тры паны урадзілі і умысьлілі: князя Зыгімонта а сьмерць прыправіці. А іншых князёў і паноў на тот час пры Зыгімонце нікога ня было,—і на том раду сваю заставілі, іж самым ім гарады Вільню і Трокі засесьці і дзяржаці іх на князя Сьвідрыгала, каторы уцёк да Валох па паражцы Пабойскай ад Міхайлушкі Зыгімонтавіча. І урадзілі так і направілі двараніна, родам кіяніна, на імя Скабейка,—і далі яму трыста воз сена, а на кожды воз па пяці чалавекаў у збруях пад сена улажылі і па чалавеку, што вазоў дзяржалі,—і адправілі таго Скабейку да Трокаў, якобы з сенам дзякольным. І адправіўшы Скабейку, і паслалі да Валох да князя Сьвідрыгайлы іскаці яго. А князь Аляксандра Чартарыскі з Скабейкам уехаў у замак Троцкі ў нядзелю Вербную. У той-жа час сын князя Зыгімонтаў вышаў з града да касьцёлу, а сам князь Зыгімонт слухаў мшы у замку ў ложніцы. І уехаўшы князю Чартарыскаму з Скабейкам со усімі тымі вазы ў горад і горад затвары; і людзі оныя усе вышлі з вазоў і пашлі проста да ложніцы князя Зыгімонтавы, гдзе он мшы слухаў. А быў у князя Зыгімонта мядзьведзь, у каторым вельмі ся кахаў: і заўжды, калі прыходжываў да ложніцы, і как лапаю дзярнуў, тагды яго заўжды пушчано. А так князь Чаратарыскі з Скабейкам, прышодшы са усімі тымі людзьмі, і дзярнуў рукою па дзьверам. І князь Зыгімонт мнімаў—мядзьведзь, і казаў дзьверы адчыніці. І тот час кінуліся да ложніцы. І пачаў князь Чартарыскі, вымавяці яму усе яго злыя учынкі, што он чыніў над усёю шляхтаю вялікаго князства, а к таму што яшчэ умысьліў быў на астанак на том сэйме усіх князёў і паноў і увесь ражай шляхецкі выкараніці і кроў іх разьліці, а псю кроў хлопскую паднесьці. І тыя словы вымавіўшы, рэкл на астатак: «Што ясі быў пагатаваў князём і паном і усім нам віці, тое ты цяпер пій адзін!» І кінуліся к яму, хацячы яго убіці; папежа не было чым, і тот Скабейка ухапіў вілы, у коміне што агонь папраўуюць, і тымі віламі ударыў яго у тот час, как Божае цело падносіў каплан. І кроў скочыла з галавы на сьцяну, каторая-ж і да днесь ест на сьцяне у ложніцы на вежы у большым замку Троцкім. І ў тот час пау на паго мілостнік яго, на імя Слаука, па хоцячы відзеці сьмерці гаспадара сваяго, папежа бо вельмі быў люб вялікаму князю Зыгімонту. А ані таго Слаўку узялі і кінулі акном з вежы, і он там шыю зламаў, а князь Зыгімонт у тот час жывата даканаў».

Цяпер Трокі бедны павятовы гарадок, заселены найбольш караімамі. Значэнне Трокаў і яго славутных замкаў стало падаць разам з сьмерцю караля Зыгмунда-Аўгуста (1572 г.).

Увесь бераг Нёмна, што аддзяляе цяпер Троцкі павет ад Сувалшчыны, усеян руінамі замкаў, — сьведкаў безупынных набегаў і крывавых бітвах з рыцарамі. Асабліва зьвяртае на сябе увагу гістарычнае мястэчко Пуне, або Пілен, помнае крывавымі бітвамі з Ордэнам. З гэтым мястэчкам зьвязано трагічнае здарэнне, як перадалі яго нам летапісцы. У пачатку XIV веку на крутым беразе Нёмна істнавала фортэцыя Пілен, пабудованая з вялізорных бярвенняў, надзвычайнай тоўшчы. У 1336 г. гросмэйстар Тэадорык Альтэнбургскі, з многачысьленаю раццю, аблажыў Пілен. Гарнізон фортэцыі складаўся ўсяго з 4.000 чалавек разам з жанкамі і дзяцьмі, але на чале гэтай невялічкай дружыны стаяў храбры і адважны князь Маргер. Аблажаныя бараніліся з усіх сілаў. Калі на працягу дня крыжакі усьпявалі зрабіць якую шкоду сьценам фортэцыі, дык абаронцы за ноч яе папраўлялі. Нарэсьці крыжаком пашанцавало прыблізіць да сьцен усе свае сьценабітныя машыны, зашпурнулі у сярэдзіну каля 600 стрэлаў з агнём і запалілі фортэцыю з розных бакоў. Ратунку ня было. Тагды Маргер загадаў разлажыць вялікі касьцёр, склікаў каля яго усіх сваіх храбрых ваякаў і запрапанаваў ім памерці, але не здавацца. Ніхто не спрачаўся, і ўсе згадзіліся на гэтую адчаенную пастанову сваёго князя. Прышла жрыца і стала адсякаць галовы тым, хто аддаваў сябе на сьмерць. Уся маетнасьць была кінута ў вагонь. Разьня цягнулася доўга, а тым часам рыцары надступалі бліжэй. Тагды Маргер, пусьціўшы у ворага яшчэ некалькі сьмяртэльных стрэлаў, кінуўся ў падзямелле, закалоў там сваю жонку і дзяцей, а потым пракалоў сам сябе сваім уласным мячом. Апошняя кінулася у вагонь жрыца і ужо дагарвала, калі увайшлі у фортэцыю крыжакі. Яны не знайшлі там ніводнаго жывога чалавека. Польскі поэт Сыракомля авіршаваў Маргера у напісанай пад гэтаю назваю поэме, а Крашэўскі напісаў цікавае апавяданне на гэты тэмат—„Клосы".

(Канец будзе).

Я. Л-к.



Тэатр на вёсцы.

Даўно ўжо і цяпер часта пішуць і гавораць аб тым, што беларускі народны тэатр павінен мець вялікае значэнне у справе нацыянальнаго адраджэння народу. У гарадох і мястачках за апошнія часы беларускі тэатр пачаў папыраціца. Але трэба сказаць папраўдзі,

што найчасьцей ён не выпаўняе сваe важнай ролі. У нас прывыклі выбіраць такі матэрыял і так іграць, каб было больш сьмеху. Часта выводзяць беларуса ў адваротных постацях і вельмі рэдка паказваюць таго ціхаго, добраго, вечна шукаючаго праўды і згоды, беларуса.

Цяпер з радасьцю трэба адзначыць, што наш тэатр пашыраецца ня толькі на малыя мястэчкі, але і на вёскі. І вось тут мы бачым тыя парасткі, з якіх некалі вырасьце харошанькая расьліна. А на здаровых і моцных галінках вырастуць пышныя кветкі. Той сьветлы нацыянальны дух беларуса вывядзе яго на родную дарогу, згоніць з яго цьвілізну, якая насела ў час сну, і пакажа беларуса чыстаго, як вада Нёмнавая.

Як вядома, вайна прынесла нам вялікае няшчасьце. Папсавала эканамічнае жыцце, заразіла і псыхолёгію беларуса. Чыстыя вясковыя сяляне былі заражаны рожнымі псыхолёгічнымі хваробамі: распуста, неўважэнне свайго роднаго, а з тым і патраты чалавечаго гонару, пераймание ўсяго чужога. Разам з усім гэтым зьявіўся нейкі шолам, каторы вадзіў чалавека, як пьянага, зацямняў шлях, па якому трэба было ісьці далей.

Але надта жывучы дух народны, каб гэтай заразы ды не пазбавіцца. «Пойдзе дымам усё ліхое».

Мне хочацца расказаць аб адным дзеле.

У сяле Мікалаеўшчыне, Менскаго павету, 13-го кастрычніка адбыўся спэктакль, ці, мо' праўдзівей будзе сказаць, беларуская вечарынка. Наладзілі яе мейсцовыя і акалічныя вучыцялі, разам з селянскаю моладзьдзю. Наўперад пастаўлена была пьеса «Ня розумам сьцяміў, а сэрцам», а пасьля пачаліся гульні.

Селяне ужо раз бачылі тэатр у сяле. Салдаты, паставіўшы балаганы, вычваралі розныя штукі. Сьперша так думалі і аб гэтым тэатры. Але вось тут выйшло іначай.

Трэба заўважыць, што пастаноўка была надта добрая. Сцэна—настаяшчая хата. Усё было зроблено надзвычайна старанна і добра. А што датыча ігры артыстаў, дык можна сказаць толькі адно добрае. То была ігра--настаяшчае жыцце. Ось тут-то відаць было, што іграюць беларусы! Так і праходзяць жывыя тыпы ідэальнай дзяўчыны, добрай мацеры, строгаго бацькі, жартаўніка беларуса. Ролі дачкі і мацеры былі выпаўнены з такім чуццём і шчырасьцю, што зрабілі вялікае уражэнне на сялян, і я не салгу, калі скажу, што Менскім артысткам такія ролі удаюцца надта туга.

Пасьля спэктаклю вясковая моладзь, інтэлігэнцыя і дальнія госьці пачалі гулянкі. Танцавалі, сьпявалі, і усё то хораша, усё па-свояму.

Ці трэба гаварыць, што ня толькі спэктаклі, але і гэтыя самыя вечарынкі могуць прынесьці вялікую карысьць? Ці ня лепш пачытаць аб чым нёбудзь, прадэклямаваць добрую рэч, пагуляць ды павесяліцца ўкупі, як марнаваць ночы, гуляючы у «двацдаць адно»?

А знаходзіліся людзі, каторыя лічылі непатрэбным гэтую работу. То былі працiўнікі беларускаго адраджэння (каторыя ня былі на спэктаклі). Ці-ж не апілкамі іх галавы напханы,—скажэце добрыя людзі?!

А я гукаю голасна:

«Дай, Божа, здольнасьць, пачаўшым гэтую работу, вясьці яе далей!

М. М-ч.

У. Сыракомля.

Чысты Чацьвер.

Быу Чысты Чацьвер—паранак пагодны.
У полі счарнелым лёд гіне і тае;
Жауранкі пелі, і ветрык лагодны
Цеплыя мысьлі у сэрцо зганяе.
Хінуцца людзі да Бога і сьвета,—
Міла для сэрца вясны пара гэта;
Цісвуцца хмаркі па сіняму небу,
Ранняя мгла ахіліла ужо глебу,
Над ціхай вёскай скрозь полаг свой сьцеле...
Звон гудзе нудна... імша у касьцеле.

I.

Перад званіцай замшовай, драулянай
І пад пахіленай сьценкай касьцёла
Сёння люд Божы усюль навакола
З тайнай вялікай сходзіцца зрана—
Грэх свой і болькі, за год пеража́ыты,
Вызнаць з сьлязьмі каля гратау на вухо
І посьля—цяжкаю скрухай разьбіты—
Хлеб спажыць мілы—дар Божаго Духа.
Покі касьцёл арганісты адчыне,
Люд да званіцы што-раз прыбывае:
Моліцца нехта, той грэх успамінае,
Тыя гавораць,—і час неяк міне.
Есьць аб чым весьці размову вясною:
Час з сахой выйсьці, а тут німаш хлеба,
Луг апранецца няскора травою,
Быдло для працы хоць як карміць трэба;
Сена няхватка ужо у вадрыне—
Вязка апошняя зьесца у хвілю;
Рунь штось с-пад сьнегу галовачку хіне,—
Бог сьвяты знае, ці голад абміне?
Хоць, бач, у кожнаго роуная была
Доля, худоба, адны таямніцы,
Але з суседам пагутарыць міла,
Сеушы на прызьбе, ля самай званіцы.
Міла «патакаць» у шчырай бяседзе:
«Так, так, Бог знае, што будзе, суседзе!»

II.

Ключ аб ключ бразнуу: ужо арганісты,
Шэпчучы псальмы, прайшоу па цьвінтары.
Старцы гавораць: «Вось дзень урачысты
Згодна адбудзем, пазбыушыся мары».
Ключ стары скрыгнуу у замку заржавелым;
Млее, дрыжыць стогн, калоціцца зволі;
За арганістым люд крокам нясьмелым
Сьледам уходзіць у касьцёл што-раз болей.
Хаця напціпшэй грамада прахадзіла,
Рэхо той тупат нягулкі адбіло.

III.

Касьцёлік убогі. Там-сям па пары
Чадзяць васковыя жоутыя сьвечкі.
Вобраз старэнькі у самым аутары;
Хрыстус маленькія пасьвіць авечкі,
А па бакох вось—налева, направа—
Божая Матка і «сьвенты» Антоні;
Анёл прад імі укленчыу слухава,
Патрон лялею трымае у далоні,
Твар і узгляд яго ясны, набожны,—
Песьціць Дзіцятко сваё асьцярожна.
Тут пры амбоне ёсьць дзьве спавядніцы,
Абраз старэнькі: на ём Збауца сьвета
Ключ ад нябеснай аддау таямніцы
Пётру сьвятому,—то ласкі прыкмета!
Ля самых лавак пастаулены збоку
Пара пратэсау, з іх кожна падзёрта:
Там сьвяты Юры гарцуе на цмоку,
Тут сьвяты Міхал баракае чорта,
Пальмачку Войцех дастау ад анёла,
Сьмерць увесь люд падзывае наукола...

IV.

Скрыпнулі дзьверы; грамада вясьнякау
Міла узглядае туды за баляскі:
А ксёндз старэнькі укленчыу, заплакау:
Просе прад сповед зьдзю Божае ласкі.
Пау ля падножжа аутара сьвятога,
Глуха азвалося рэхо у склепе;
Служкі касьцельнаго, хлопца малога,
Ценэнькі голас Miseratur трэпе,
І Confiteor з дзяцінных вуст лыне,
З усьмешкаю ціхай, з абмылкай у лаціне.

V.

Плебан падняуся, з малітвай у згодзе
Да спавядніцы паволі падходзе,—
Промянем зьяе абліччо сьвятое;
Скрэсьліу знак крыжа, а людзі пад тое,
Сьціха жагнаючысь, цяжка уздыхнулі.
Лагодна кіунуушы, ксёндз першаго з краю
К граткам пакутным к сабе падклікае.
Бліжшыя сьведкі далей чуць умкнулі.

Стулу узьдзеушы крыжам на грудзі,
Ксёндз цёплым словам і цешыць і будзіць
Глыб душы смутнай, што змучана дыша,
Бог адзін толькі размову іх слыша.

VI.

Той, другі, трэці, за ім і чацьвёрты,
Зьліушысь сьлязамі, адходзе ад гратак.
З скрухай праудзівай у сэрцы разьдзёртым
Споведзі шчырай ліецца астатак.
Ксёндз больш ня чуе, а Бог яшчэ слыша,
Як люд пакорны у далонях твар крые,
Шле ён пакутныя пацеры у цішы
Сем раз «Айчэ наш» і «Здровась Марыя».
Покі-ж сардэчна, як Збауца у Агройцу,
Модлы на споведзі люд адпраукае
І раз апошні шапне: «Хвала Ойцу»,—
То з шыб касьцельных промень спадае.

VII.

Дзевяць і дзесяць гадзіннік бье глуха.
Ксёндз паміж гратау сядзіць, спавядае.
Люд пачародка грэх шэпча на вуха,
А то з адпустай ідзе—ксёндз жагнае.
Кленчыць адзін, зноу другі, а там трэці
Перад абразам, як малыя дзеці.
Пэуне,—які-ж бо быць грэх у іх можа?!
Той штосьці пану адбуркнуу нягожа,
Той прадау жыта задораго вельма,
Трэці у нядзелю упіуся, як шэльма,
Альбо на братні надзел хто сягае,
Косячы, межу суседа займае,
Ці мо' у летку дожджы дакучалі,
Дык у клапотах, каб сено ня згніло,
Крывава працуючы, сёмы дзень вале,—
Ломе нядзельку—і у сьвято так было,
Мо' наракау з іх хто часам на Бога;—
Во грэх селяніна—скарга, трывога.

VIII.

Плебан, што з людам пражыу свае жыцце,
Стау яго бацькам: кірує, правадзе,
Знаючы грэх іх і сэрца іх біцце,
Лекау гаючых дае ім і радзе.
Слоуцо уцехі і слоуцо парады—
Шчырая кладзьба на усе Збауцы раны:
Зараз жаль пройме, сьлеза выплывае,—
Грэшнік пакорны ужо з Богам зьлднаны.
З лёгкай душой, без уціску сумлення,
Выйшау з адпустай — хто варт разграшэння.

IX.

Так пачародна народ надступае;
Скора селянка пры гратах тут стане,
Добрую душу пакора змушае
Поуніць касьцелау сьвятых прыказанні.
Твар [illegible] лагодны. Злой мысьлі ня мае
Ані у усьмешках, ні у шчырым пагдядзе,—
Грэх і [illegible], аднак, сьлед пакідае
І на [illegible] межа з думак сядзе.
Моза з [illegible] жыцця і падол,
Тут [illegible] хоча спакой свайму духу,—
Хто-ж [illegible] ведаць? Мо', нервючы болі,
Жаль [illegible] моцны выбіць сваю спруху.

Хоць на галоуцы калючак ня мае,
Што уядаюцца у цемя знарову
Ні тых маршчынау, што век укладае,
Нібы як з літар, на твары глыбока
Жыцця гісторыю. Промнем злацістым,
Зьяе бязвіннасьць на вобліччу чыстым.
Нібы стыдаючысь, к гратам нясьмела
Наша пакутніца што-раз бліжэла.
Гэтак руменіцца грэшнік ня можа,
Гэта ня ганьба, ня сорам—крый Божа!

X.

Ксёндз знамя крыжа адзначыу над ёю.
Дзеуча жагнасцца, кленча пад граты,
Тулючысь сьцісла к сьцяне галавою:
Рукі злажыла і—споведзь зачата.
Сьведкі! Схініцеся, слухаць ня можна,
І у твар паглядайце ёй асьцярожна,—
Хай ваша вухо граху ня прыкмеце,
Кожны з вас твару хай смутнай ня відзе:
Слово падчутае,—ведайце праце,—
Споведзь дзяучыны зьнявэча, абідзе.
Дайце ёй шчыра прызнаціся Богу,
Хай сілы узмоцніць у мілым натхненні,—
Хвіля, другая—уступе дарогу,—
Споведзь каротка, як дыху патхненне.

XI.

Цэлы квадранец, як споведзь дзяучыны
Цягнецца. Людзі глядзяць вось цікава:
Бачыш, бье квадра і бье поугадзіны,
І што раз далей гадзіннік бье справа.
Плахтай укрыушыся, дзеучынка тая,
Кленчыць яшчэ перад гратай пакутнай,
Плебан старэнькі, як бацька, пытае.
Шэпча на вухо ёй штось памінутна.
Кончана споведзь. Пакутніца здалю
Пала расчулена ля спавядніцы;
Бледная, плачa, калоцючысь з жалю,
Сьлёз ня стрымае. А ксёндз таямніцы
Выслухау добра і доуга маліуся.
Твар пахмурнейшы што-далей рабіуся,—
Мусіць за цяжкі ім грэх быу пачуты.
Ох, калі грэх той сапшэціу нябогу
І заслужыла чысцовых мук многа,
То цяпер одпуст, напэуна, мець будзе.
Першы раз глянула вокам, бо людзі
Вельмі цікавяць: узгляды зьвіцаліся,—
Тысячы джалау ёй у сэрцо упіліся.
З тугі вялікай, хоць надта хацела
Плач стрымаць, горкі дзя сіл больш ня мела.
Лканне балеснае чуюць у касьцеле...
Посьля, каб людзі ужо не глядзелі,
Вочы у абедзьве укрыушы далоні,
Хутка адходзе між цёмных філярау;
Там, перад Маткай Найсьвентшай у кароне
Падае ніцма, складае ахвяру.

XII.

Тым часам споведзь ішла чарадою,
Той, другі, трэці падходзе з віною,
Шчыра прызнаушыся, ольчы крыжа:
Дзеука ці матка, ці муж, ці удава,
Так пачародна усіх зачыны пакуту...

Ксёндз адпушчае грахі праз мінюту.
Ад спавядніцы адходзе люд крыху...
Старац касьцельны на ранню мшу звоне;
Хвілею тою, з сівізнай на скроні,
Дзед падыходзе да гратау паціху.
Укленчыу пакорна, жагнаецца зволі,
Цяжка уздыхнуушы, свой твар засланяе,—
Простае сэрцо ня маніць ніколі,—
Шчыра грахі на адным выкладае.
Грэх невялікі мог быць у чалавеку,
Што у ціхай вёсцы з прастымі людзямі
Век аджывае, і у цэлым тым веку
Скрыудзіць суседа баросся часамі.
Чыстая кроу, што на жылах бье ціха,
Сталыя мысьлі заве да спакою,
Любасьць, нянавісьць ня рвецца ужо ліха,
Сэрцо ня іграе, як даунай парою.
Дарма на хорах злуе арганісты,
Хоць і пара ужо імшу адпрауляці,
Старац праз хвілю абрад урачысты
Скончa; ксёндз доуга ня будзе трымаці,
Мша праз квадранец зачнецца, — ні далей,
Сьмела хай сьвечкі закрыстыян пале.

XIII.

Старац, тым часам, кажа усё віны:
Люд, зацікавіушысь, здале вартуе,
Зэгар касьцельны прабіу поугадзіны,
Бье тры квадранцы — ксёндз з старцам талкуе.
Вось закрыстыян з нецярпеннем чакае,—
Снуе усюды, стау хлопцау ганяці,
А арганісты «Introit» іграе,
Каб з спавядніцы ксяндза адазваці.
Сьвечкі гараць пры усіх ужо аутарах,
Псальмы пакутныя сьпеяла грамада:
Ксёндз спаведае, між імі йдзе рада,
Відно узрушэнне у абоіх на тварах.
А як, нарэшці, па споведзі мілай,
Старац пау тварам, ксёндз пацер стау правіць,
То, па вачах іх пазнаць можна было,
Што яны плакалі,—мабыць пазбавіць
Старца ад граху ксёндз ня меу права.
Моцна дзед плакау—дзіця, быц. малое;
Ніцма лежау, а народ так цікава
Быццам на дзіво глядзіць: што такое?
Доуга дзед плакау і енчыу з прытугі,
Твар у касьцістыя скрыушы далоні...
А цераз хвілю з ксяндзом разам слугі
Выйшлі ужо на мшу. Званок ярка звоне,
Ксёндз пяе «Gloria» звычайна, як трэба,—
Чэцьвярам Чыстым ахвяра для неба.
Цікба народу абняла баляскі,
Моліцца, у грудзі бье шчыра шмат разы,
Каб як дажджаціся Божае ласкі:
Цела й Крыві Збавіцеля без змазы.
Пацер з ахвярай набожнай злучае,
Мукі Хрыстуса у душы разважае.

XIV.

Ксёндз узяу пальму, чытае у мшалі,
Што сьвяты Лукаш аб муках тых піша;
Хрышла сьпяваючы «Горкія Жалі»
Арганіст пальцамі ціснe клавішы.

Моліцца цімба... хто добры тон мае,
Той арганістаму у тахт памагае;
Хлопцы касьцельныя сьмела і чыста
Кажуць адповедзь »Faus Łibi, Christe!“
Грымкнулі разам клякоткі старыя
У гэтых хлопцау свавольнай далоні,
Божны на »Sanctus« па дзевяць раз звоне,
І як кверху падыме ксёндз Дары Сьвятыя,
Келіх ці Гостыю. Але клякотка
Моцна заляскае у шмат разы можа,
Як ксёндз дастане ужо пушку з сяродка,
Зьвернецца к люду і пачча хлеб Божы
Прыме. А слугі у тэй самай хвілі
Белаю капай балярскі абкрылі.
Люд у рад кленча са сбрухай на твары,
Рукі як нібы у гробе складае.
Жанке, мужэ, дзеці, дзеучаты, дзед стары.—
Кожны прад Гостыей мысьль спавядае.
Ксёндз пражагнаушы люд увесь касьцельны,
Скора падходзе к грамадзе спачатку
І, паутараючы тэкст эвангэльны,
Гостыю у вусны кладзе па-парадку.
Кожны, спажыушы, скрыць радасьць ня можа.
Сёння бо у грудзях гасьцюе Сын Божы!
А пакідаючы зволі балярскі
Рады старыя, і моладзь і дзеці;
Знаць па вачах іх, што варты ужо ласкі,—
Твар іх спакоем і згодаю сьвеце.
Ці-ж то падоуга? Мой Божа, мой Божа!
Вельмі душа чалавека слабая:
Ліхо у парозе, на могілках можа
Забраць спакой наймілейшы чакае.
Покі дзень заутра крыху разьвіднее,
Сколькі-ж над намі хмур зьвісьне ізноу?
Скарб нашай споведзі з хвілей малее,
Мы пешчасьлівы і грэшны панова.
Але, каб толькі ставало ахвоты,
Есьць для пацехі нам: сьлёзы, хлеб Божы;
Тым толькі цяжка, шмат жалю, нудоты,
Ксёндз адпусьціць каму грэху ня можа;
Тыя ня могуць спажыць Божых Дарау,
Мусюць ад стыда шукаць сабе сховы;
Мусюць туляцца між цёмных філярау,—
Так, як дзяучына і старац вясковы.

XV.

Сьвечкі згасілі, каберац прыбралі,
Сьвяты Сакрамант на мейсцо схавалі,—
Рытуал Рымскі у Чацьвер Вялікі
Споунены пекна... Чутны толькі усхлікі,—
Горкай сьлязою увесь народ зьліты,
Моліцца шчыра і бьецца у грудзі,—
На успамінак, як Хрыстус пабіты
Быу у Пілата, год з тысяч дзьве будзе.
Ксёндз, што ад досьвітку працу нёс срога
Зьдзеу ужо орнат, ідзе спачываці.
І арганісты прысьпешвае многа.
Ляд сьпевы скончыу—ужо ня чуваці.
На мове сьляпцау чутно у здагадку.
Што люд адыйшоуся далёка і скора.
Змучаны два жабракі на астатку
Ідуць, кульгаючы, к дому з узгорра.
Толькі прад облікам Найсьвентшай Панны
Старац з дзяучынай зносяць лёс срогі.
Неразграшоныя. льюць бязустанна
Сьлёзы і туляць свой твар да падлогі.
Старац падняуся, як сілы ставало,
Кіем падпёршысь шоу, молючысь Богу;
Дзеуча йшчэ доуга свой жаль вымаулял,
Посьля устала, пашла... ля парогу
Скленчыла, крыж на сябе палажыла
Ды цераз поле барджэй пасьпяшыла.

XVI.

Здаля за вёскай відаць вунь магілы;
Крыжау дрэуляных тырчыць там багата,
Дуб за магілкамі думны, пажылы;
Далей бярозка, пры ёй прыпадняты
Насып пешчаны, аброслы дзіка:
Тут ня чуваць жаднай птушачкі крыка.
Гроб у канцы быу. У ім ужо дауна
Сын удавы спачывае самотны,
Колісь на скрыпцы іграу надта слауна,
Песьні у жніво складау ён ахвотна.
Посьля прад сьмерцю сваёю рок цэлы
Змоук, як-бы сьценка; ня вырак ні слова,
Як у пасланні. Нарэшці папова
Піць стау ганебна, з людзямі стау сьмелы.
А калі часам ня меу з кім дзяліцца,
Сам адзін піу так бяз меры, без краю;
Споу, як шалёны, як нібы-то скрыпца
Думау у мшарах далёкіх ці у гаю.
Праве паугода, ці можа і болей
Піу і пеяу ён аб злой сваёй долі.
І цераз трунак збалеу надта, знужау,
Зьдзёрлося сэрцо і пульс біу гвалтоуна,
Мелі лячыць бедака, бо зьнядужау,
Але уцёк ён, сказаушы: «Усё роуна,
Беднаму хлопцу папрасна лячэнне;
З лекароу жадны ня дасьць палягчэння,
Лепяй у лесе самотнаму марыць.
Голасна песьні па волі пеяці,—
Чымся у вёсцы, паміж сваёй брацці,
Паміж вясковых дзяучатак састарыць.
Там у прасторы... Пусьціце самога,
Думак і песянь злажу я там многа,
Там-бо дзяучына мне сэрца ня струе:
Міласьць дадзержа, калі дэбляруе».
Брэдзючы гэтак адрэчы баз долі,
Сьвет праклінае і пье што-раз горай;
Песьні заводзіць аб шчасьці, аб волі,
І аб каханні, аб цлузе, аб моры.
Часам у лесі бярозку, яліцу
З плачам абніме рукой у палайцу,
З ціхай усьмешкай праз сьлёзы пытае:
«Ці-ткі, сапрауды, яна йшчэ кахае?
Шчыра ці будзе кахаць яго, верне?»
Потым аслабеу наш нябога бязмерне,
Змоук і ня піу і ня еу, і зьбляднелы
Тут, пры дарозі, аддау Богу душу.
Людзі знайшлі яго труп пасінелы,
Тут у канцы пахавалі пад грушу.
Але як быу нешчасьлівы пры жыцці,—
На вёску няшчасьце прыйсьці ад пальцы.

Тыдзень, ня болей прайшло. Во з прыказам
Сьмале пачтовая тройка імглою,—
Прэцца у вёску з урадпікам разам.
Кожны стрывожана шапку здымае,
Голаву хіліць, паклон адбівае.
Кожны з прымусу прыймае прысягу,
Што бедны хлопец меу усюды павагу
І што з пухлізны памёр ён, нябога,
І што вады ужывау вельмі многа.
Хто-ж прысягаць ня хацеу—адказауся,
Той плаціу грошы. А хто па прыказу
Прысягу прыняу,—таму Бог адразу
Кару зазначыу—ён бедным застауся:
Дзеці, здароуе, здабытак—рукою
Гінула, чэзло з агнём і вадою.
Во і ня дзіво, што у вёсцы усякі
Злосна успомне, бо дауся у знакі.

XVII.

Хутка дзяучына бяжыць куды вочы,
Аж да магілы, ня знаючы згрозы;
А пры канцы ужо старац шапоча
Ціха малітву, крыючы сьлёзы.
Не па згавору зыйшліся—з прычыны,
Бо разграшэння яны ад плебана
Сёння удвох, спавядаушыся зрана,
Не атрымалі, бо Бог іх правіны
Ім праз ксендза вось ня мог дараваці.
Але няужо-ж-ткі віна тых двух брацці
Мела штось спольнае з тою магілай?
Што іх двух вяжа з страшнаю сілай?
Грэх ці адкупяць свой, плачучы столькі?
Бог адзін знае, а ксёндз другі—толькі!

XVIII.

Белаго сьнегу пушыстая капа
Дзе-ня-дзе трохі чарнець пачынала...
Цёпла падворье, мінула ахляпа,
Там сям с-пад лёду руччоу струя гнала
І, спаласкаушы узораны нівы,
К рэчцы цягнууся іх шум галасьлівы.
Толькі на узгорках, на гэпай магіле
Суха, жвір жоуты сьвяціуся здалёку.
Цень на блакіце адзначвае усхілле
Старца, што кленчыу пры гробе тым збоку.
Бедны, схіліушыся нізка, чытае
Псальмы з кантычкі і сьлёзы раняе
З твару, укрытаго моцна у далоні.
А як рукою сьлязінку са скроні
Сьцёр і стау згортаць волосы з твару,
Дзеучына, узглянууушы, скора пазнала
Грайку вясковаго. Нам роуную кару
Ксёндз дау абоім—ці што яму стала?
Чым да нябошчыка меуць ён што можа?
Не, нават мысьлі пускаць тэй ні гежа!
Ен для нябошчыка быу лепшы ад брата,
Споу разам песьні, іграць вучыу міла,
Быу неразлучны у будні і сьвята
І за сумленнасьць уся вёска любіла.
Жадпаму у жыцці ні зробіу абразу,—
Але чаму-ж яму ксёндз разграшэння
Сёнпі на споведзі даць ня мог зразу
І на магілу прыпшоу, каб прашчэння,
Плачучы, выпрасіць у свайго друга?
Чым-жа ён [illegible], і што за прыгуга?

Старца, угледзіу[illegible] [illegible]еучына тая
Мела ужо скрып[illegible] ды дзед той у хвілі
Глянуу і мо[illegible] прыпамінае,
Роіцца—[illegible]зам сягоння дзесь былі.
Х[illegible] узгляд уляпіушы ёй у вочы,
Дз[illegible] сьмяецца: «Відаць гэта чары!..
[illegible] сэрцо тут сплакацца хоча!?.
Двух нас тут—збауцау—ля гроба ахвяры...
Знаю, бо чуу я... Чаго-ж ты, нябога,
Сёньні прышла сюды? мысьліш сьлязамі
Цень упрасіць яго?—Не, ужо нічога
Плач не паможа. Мы вінны тут самі;
Вечным сном бедны Сымон спачывае.
Ен толькі нас абаіх, любіу дужа.
Што-ж у падзяку за гэта ён мае:
Ты [illegible] горо, я—джало ад вужа».
Сказау так сярдзіта, зноу бярэ у рукі
Кс[illegible]жку і псальмы пакутныя правіць.
Бедная дзеучына шмат церпіць мукі,
Сёння пяшчасьце жыццё яе давіць.
Цьмяцца ёй вочы, у твары бляднее.
Кленчыць, заломіушы рукі пры гробе,
Хвапе пяску горсьць і з жалю аж млее;
Цісьне жвір к твару — ня помне, што робе.
Плача крыёма і енк ціха тое,—
Лепсьве ужо месьяцць яго яе грудзі.
Ст[illegible], разжалены моцна, пад тое
Кажа: «Дзіцятко, паплач, лягчэй будзе».
Радзючы беднай у цяжкай нядолі,
Ціха заплакау і сам з тэй адмогі;
Лягчэй таму стане і зьменшацца болі,
Хто яшчэ можа паплакаць з трывогі.
Дый незаусёды той камень, што цісьне,
Звалiцца з сэрца і сьлёзкай павісьне.

XIX.

Плакала моцна дзяучына; здаецца,
Сьлёзы наскрозь аж у гроб дахадзілі,
Столькі у тэй кропаі, с-пад сэрца што рвецца,
Сілы жывучай і жалю у той хвілі.
Плач ле, моу пасланец той ад Неба,
Мукі аблегчыу, уцеха ёй мніцца.
Сэрцо дзяучыны пачуло, што трэба
Словам з кім небудзь цяпер падзяліцца.

XX.

«Вы на мяне усё? Мой Божа... дзіулюся!
Хочаце бідаць забалец нягоды...
Мілы Тарасе, на усё я сьлянуся!
Як Бог на небе, як ёсьць дзень пагоды,
Несправядліу ты, ня зводзь мяне к болю!
Калі я й грэшна, то мо' праз сваволю.
Пэуне, казау ён, калі, у якой хвілі
З ім я зыйшлася і гдзе яны жылі,
Гдзе Сымон з маткаю хатачку мелі,
Як спатыкаліся мы што нядзелі,
Як на Сымова уся вёска, бывала,
З нейкай абрыдай усьцяж паглядала,
Бо з імі разам ня вёу ён забавы,
З твару праз тое ня быу ім цікавы.
Але я постаць і твар сіраціны
Крэпка узлюбіла усёю душою,
Узгляд яго войстры, ласкавая міна
Сэрца сяродак дастане бяз бою.
Часам, сабраушысь, суседзі, суседкі
Весела жарты разводзюць і сьмехі;
Скажуць пустое—вось так для пацехі,
Ен толькі гляне, але узгляд меткі
Мігам прыстыдзіць. Дык божны баяуся
Жарт які дрэнны сказаць пры Сымоне;
Так між усімі ён стала трымауся,
Слова ня скажа — ды узгляд у сэрцы тоне.
Вось, калі часам між гурту самотны,
З радасьцю у вочы яму паглядаю;
Сэрцо узгадвае мысьлі ахвотна,
Альбо аб чым ён казаць яшчэ мае.
Але-ж і ён во,—ня раз прыкмечала,—
Мысьлі мае адгадаць умеу скора,
Як-бы то дзіво яму памагало.
Мілы Тарасе, я шмат мела гора!
Днём ня убачу яго, дык мне смутна,
Сны ноччу лезуць, аж жыць мне ня міла...
А там над рэчкай, пад вербай пакутнай,
Камень ёсьць... там мы, ня раз гэта была,
Сядзем, гаворым... У вечар пагодны
Шастае ветрык цаплюткі, лагодны.
Часта Сымон тут з работы прысядзе,
Мне зноу здарэнне, патрэба,—паможа
Бегчы у тую старонку пры стадзе,
А то матуля пашле чаго можа.
Бацька прыпомне калі пры вячэры,
Што у затоцы ня уставіу вяпцеры,
Альбо забыуся на беразе вуды,—
Мушу пабегчы, бывала, усюды.
А там над рэчкай Сымон прывітае,
Дасьць «добры вечар», аб чымсь запытае,
Рада ня рада—выслухаць мушу...
Чы-ж я любіла?.. Шчаміло штось душу!..
Бо Сымон часам кажа мне: «Марта,
Хоць будзем бедны, ды будзем у пары,
Аб іншым жыцці і мысьліць ня варта!
Але, сястрыца, пакуль усё мары,
Покі нас шчасьце абодвых зьяднае,
Покі у бацькоу папрашу дазваления,
Покі к аутару падойдзеш,—сьвятая,
Шчыра прызнайся, адкрыйся сумлення,
Чы мяне любіш? скажы мне, нябожа!
Але ты, Марта,—крый Божа! крый Божа!
Мысьлі папусьціш свае за другімі,
Шчасьце шукаць ты пачнеш паміж імі,
То тагды будзе беда нашай долі,
Лопне апошняя нітка у жмені...»
І аж заплакау; прад ім на калені
Марта прыпала. «Не! Бог не пазволе,
Каб наша сэрцо забілося здрадай,
Ці мо' астыло, ці спыцілось вадай!»
Меу мне шчасьлівы Сымон штось сказаці,
Але час позны,—умкнула я з лавы
З радасьці мо', ці з апаскі—як знаці?
Сэрцо дрыжэло. У хаце цікавы
Бацька пытае у Марты прычыну,
Што так збляднела, насупіла міну.

(Канец будзе).

Пераклау **А. Пауловіч**.

З паперау К. Каганца.

Такая доля.

На краю лесу лістоваго, падшытаго арэшнікам і паутыканаго старымі разьвесістымі хвоямі, на мяккай, зіхацячай усякімі краскамі траве, лежау дзяцюк. Гадоу з восемнаццаць яму было; а недалёчка яго пасьвіуся конь буланы.

Лежау той хлапчына чарнявы, залажыушы рукі пад галау, і відаць добра яму так было, бо вочы яго карыя неяк весела глядзелі то на воблачкі белыя, каторых лёгкі цёплы ветрык гнау кудысь па чыстаму сінему небе, то на расінкі, вісячыя на лістох і мігаючыя рознымі аганькамі і каторых соуньейко, недауна вылынуушае з-за лесу, яшчэ не усьпело асушыць. Часам наслуховывау, як-бы старающыся рас[illegible] пту[illegible]чыя галасы, ды гэта яму, пэуне, не удава[illegible] [illegible]кіх лясох уеякая твор Божая любіць праб[illegible] [illegible]лёныя птушачыя галасы з зыкам усялякіх мошак ды казявак зьліваліся у вадну музыку, каторая чаруе, так сказаць, л[illegible]дзей, а каторую так мала знаюць гарадзкія. Харош[illegible] губы яго былі трохі разінуты, і сьвяціліся белыя, як часнок, зубы.

Ды відаць не заусёды яму так добра бывае, бо на худых яго руках жылы, знаць, ад працы былі набрыняушы, і босыя ногі яго былі патрэскаушыся і выглядалі, як кара; валасы, знаць, дауно ня чэсаныя, былі зблытаны; сьвітына, знаць, колісь бела, цяпер шэра і абтрэпана; кашуля зрэбная хоць дзеля сьвята далі яму чыстую, порціны гэтак-[illegible].

Ды вось яго пекнае аблічча чагось засу[illegible] [illegible]знаць нагадау аб сваёй цяжкай долі. Ды яно [illegible]маць! Як яму будзе, як лето пройдзе? Ен [illegible]та, служа парабкам за быля-што у мала[illegible] ад сябе і, знаць, не саусім здаровага [illegible]та значна па кані і па тым, што па-[illegible]

[illegible] лето яшчэ сяк-так, бо хоць і працуе можа і цяжэй, як другой порою, ды за тое на сьвеці цёпла і хоць у нядзель-

...кулы у сьвято мае аддышку, каня пасучы. А прыйдуць хо... зіма, мяцеліцы... Тагды што яму дадуць, апрануць? Пры...вяць да цяперашняй вопратві дзюраву, паношану кажушыну ...лацці надалятаныя. А і ён мог-бы мецi свой кавалак зямлi, ...хоць i невялiчкi з поу-чвэрцi, а усё-ж свая. Ды усё суды ...шы валастныя...

Было двох братоу на чвертцы зямлi. Меньшаго здалi у ...салдаты, а старшы застауся на гаспадарцы. Вярнууся меншы з маскалёу, застауся у двор за хурмана; там пазнауся з па...кайукаю, ажанiуся i, прыдбаушы двое дзетак, сам Богу душу ...аддау. Тады удаве дзе дзецца? Стала у дзевера зямлi да...ходзiць; дзевер ня дае, пайшлi у суд,—дзевер судзьдзяу за...дзiу, бо меу чым, а яна не здагадалася нават паноу упра...сiць, каб з членам перагаварылi; пайшла да члена у горад,—...дзевер першы дапау, завёз гладышык масла, кадобчык мёду, з ...поу капы яец i парасят са тры. Член ёй нагаварыу такога, ...што i сам, пэуне, не разабрау, а у канец канцоу прыйшло з ...прысуцтва у валасьць, каб перасудзiлi нанова. Перасудзiлi: ...далi ёй мейсцо на хату, кавалак агароду, як старой бабе се...дзi i-усё па усiм. Яна у дварэ выпрасiла вярхоуя на хату, ...людзi добрыя, за пачастунак i за добрае слово, хату зрубiлi, ...-так пазычыла на адработак у суседа грошай рублёу дзе...сяць i за гэтыя грошы накрыла, а замiж сенцау, прыставiла ...будку з лапак.

I стала там жыцi з маленькай дачушкай i на хлеб за...робляцi: летам—полiвам, грэбiвам, жнiвом, а зiмой—прадзiвам, ...старшаго сына у людзi аддала.

I вось гэты хлопец ужо i лет дарос, а усё служыць у ...таго-ж гаспадара. I ляжыць цяпер на краю лесу, коня пасе, ...думае ды гадае. А ён думаць умее!..

Лiпень 1902 г.
Менск.

Янук Порук.

Пылiнка.

(З латышскаго).

Высока, высока у паветры летаець пылiнка. У прамен...сонца яна блiшчыць i пералiваецца рознакалёрнымi хвар...цiха спускаючыся усё блiжэй да зямлi.

— Як маешся, зямелька! Як маецеся, палеткi! Як маецеся, ...ня лугi!

Бывае, вецер падымаець пылiнку угору: пылiнка пахi...ла, валiцца, аж покуль зьвечарэе i цiха стане паветро.

Тагды пылiнка, пры захадзе сонца, зыходзе на лiсто...рожы.

— Добры вечар!—прыемна уздыхае рожа.

— Вечар добры!—шапоча пылiнка.

— Адкуль?

— З неба!

Рожа чырванеець. У яе копачках заблiшчэла сьлязiнка.

— Што мая мамачка парабляець у небе?

— Цуець!

— А як маюцца мае сястрыцы?

— Цуюць... у ног Найвышняго.

— А мая малодшая сястрычка, зьвяу... ...у кацы мая, сама там?

— Яна там... пусць, румяная, румяна...

— А цi добрынька у небе?

— Мусi быць!

— Як! Няужо-ж ты не адчувала вышэйшаго кахання?

— Я—пылiнка. Я згубiлася у цудоуным нябесным зiяннi. Нiкiм ня угледжаная, не вартоуная, я вярнулася iзноу да зямлi.

Вечарковым дыханнем павеяло на рожу. Пылiнка узьнялася да яловых галiнак i апусьцiлася пасярод зялёных хвояу. Адгэтуль адкрывауся шырокi прастор на лугi, на нiвы i хмызьнякi.

Каля маладога ельнiку знаходзiуся магiльнiк. Званар як раз адчыняу вокны капліцы.

— Бiм-бом!—загудзелi званы.

Галiнка елкi цiха ускалыхнулася у вячэрнiм паветры. Але пылiнка моцна трымалася за хвойку.

Невялiчкая мурашка узабралася да самаго верху высокай галiны, каб абгледзiць гэту нязнаную частку сьвету, i убачыла блiшчэушую у пурпуры захаду пылiнку.

— Няголная бадзяка!—зашiпчэла мурашка. Пылiнка боязна глянула на мурашку i уздыхнула.

Так, яна i сапрауды была бадзяка, у гэтым яна i сама прызнавалася. Пылiнка аблётала усё чысьценька небо, здаралося быць i на сонцы i на зорках,—але нiдзе яна не магла прыспасыцiцца, не магла сабе у жыццi знайсьцi супакою. Усюды яна была толькi, як пылiнкай. Зоркi праляцелi з агнёвым грукатам, як вялiзарныя галы, па сваiх пуцявiнах. А яна, пылiнка, асталася лёганькай удалёку за iмi. Спрадвеку носячыся з аднаго мейсца на другое бяз гiбелi, але i без сапрауднаго жыцця.

У глыбокай, глыбокай старыне, калi Найвышэйшы тварыу сьвет, пылiнка у сваёй вялiкай пагардзе адлучылася адна ад прыроды. Яна жадала зрабiцца асобным мiрам. I сапрауды яна асталася адна, гэта гордая, непаслухняная, непатрэбная пылiнка.

Гэту ноч перакаратала пылiнка на зялёнай галiнцы елкi. Як настала ранiца, званар прышоу на магiльнiк i абвясьцiу, што прышла ранiца нядзелi. Посьля ён стау прыбiраць галiнамi хвояу сьвежа-выкапаную магiлу. Сягоння павiнны быць хаутуры ядынаго сына беднай мацеры.

Пылiнка бачыла яшчэ праменнi сонца пры усходзе, калi званар падыйшоу да елкi з сякерай у руццэ.

„Кнiкс! княкс!"—галiнка звалiлася да ног званара. Але пылiнка моцна трымалася за зялёную хвойку.

Скора галiнка хвойкi зьвiсла над берагам магiлы, а за зялёную хвойку моцна трымалася пылiнка.

— Бiм-бом!—званiу хаутурны звон.

— З пэтраху ты узяуся i у пэтрах абернешся...

Старэнькая мацi, сагнуушыся над краем магiлы, глядзела на чорную дамавiну, стоячую на дне ямы...

Пасыпалася першая жменька пяску. У мацеры палiлiся сьлёзы руччом.

Зазьвiнелi рыдлёукi. Пясок з глухiм стукам сыпауся на века дамавiны. Хвыдка звалiлася у глыбокую магiлу галiнка елкi, а разам з ёй i пылiнка...

— Сьпi на векi вечным сном, дармна жыушая на сьвеце пылiнка!..

Пер. Мiх. Мелешко.

КРОНІКА.

Дэклярацыя пратэсту Беларускага Ураду. Пану міністру закардонных спраў украінскае дзяржавы.

Вялікая сусьветная вайна адным з сваіх насьледкаў мела прызнанне усімі ваюючымі дзяржавамі прынцыпу самаадзначэння народаў і адбудовы гістарычна істнаваўшых дзяржаўных арганізацыяў.

Адным з першых правёў гэты прынцып народ беларускі, які у асобе свайго паўнамоцнага органу—Рады Беларускай Народнай Рэспублікі, адтрымаўшай сваю уладу ад 1-го Усебеларускаго Нацыянальнаго Конгрэсу у Менску 17-31 сьнежня 1917 года, абвесьціў актам 25-го марца гэтаго году незалежнасьць і непадзельнасьць Беларусі у яе этнаграфічна-гістарычных межах. Аб гэтай пастанове Урад Беларускі апавясьціў усе вялікія дзяржавы, высылаўляючы пры гэтым пратэст супроць падзелу Беларусі Берасьцейскай умовай. Разам з тым Урад Беларускі прасіў усе вялікія дзяржавы прызнаць дзяржаўную незалежнасьць Беларусі.

Не гледзячы на гэта, апошняя дадатковая умова паміж Расіей і Нямеччынай, падпісаная у Бэрліне 12-го жніўня гэтаго году, ізноў наносіць удар тольки што утворанай Беларускай гасударсцьвенай арганізацыі, адрываючы ад яе паўночна-усходнюю акраіну—да ракі Бярэзіны. Тым часам люднасьць гэтае тэрыторыі, неразрыўна зьвязаная і гістарычна, і эканамічна, і нацыянальна, і культурна з рэштаю Беларусі, праз вусны сваіх дэлегатаў на Усебеларускім Нацыянальным Конгрэсе ясна выявіла сваю волю—станавіць разам з іншымі часткамі Беларусі адзін дзяржаўны арганізм.

Змучаны цягатамі вайны, зруйнаваўшай эканамічнае і культурнае жыццё краю і разарваўшай яго на часьці, народ беларускі, узлажыўшы ўсе надзеі на магчымасьць свайго адраджэння тольки на злучэнне усіх беларускіх зямель і адбудову сваей утрачанай дзяржаўнасьці, бачыць у новым акце падзелу Беларусі пагрозу самаму свайму нацыянальнаму істнаванню і перад усім цывілізаваным сьветам выстаўляе дамаганне, каб усе Беларускія землі, як ужо ачышчаныя і падлягаючыя ачышчэнню нямецкімі акупацыйнымі войскамі, так і занятыя суседнімі дзяржавамі, былі аддадзены незалежнай Беларускай дзяржаве.

Старшыня Рады Беларускай Народнай Рэспублікі **Я. Лёсік.**

Старшыня Народнаго Сэкрэтарыяту Беларускай Народнай Рэспублікі і Сэкрэтар Заграінічных Справаў **І. Серада.**

Загадчык справаў Народнаго Сэкрэтарыяту Б. Н. Р. і Народны Сэкрэтар **Л. Заяц.**

Упыр.

І летні вечарок.
І пень стагоў даўжэзь.
Пры вогнішчы ляжу,
Дзе галавешкі тлеюць.

Балотны, дзікі луг...
Залоціцца травіца.
Нябёсы у вагні
Палаючай зарніцы.

А хмаркі, як той сьнег,
Як белыя авечкі,
Свой адбіваюць кшталт
У люстры яснай рэчкі.

У завадзі шурпаць,—
То качкі у чароце,
А цішыня вакол
Пануе на балоце.

Я чую, як дрыгва
Пад буслам ледзь трасецца;
Я чую, як у грудзях
Ледзь сэрцо маё бьецца.

Я пазіраю у даль,
У блакіт нябёс высока:
[illegible] і вольных хмар
Шукае [illegible]

Штось чорнае блішчыць
Над сумнаю імшарай,
Як-бы ляціць сюды
С-пад белай нізкай хмары.

Ляціць ніжэй,—на луг.
Гляджу: каршун вялікі.
Пусьціўся ён ка мне
Страшэнны, смаглы, дзікі...

Ен кіпці распусьціў,
Крывёй налітыя вочы;
За раз адзін мяне
Глынуць жывога хоча...

І я акамянеў.
Гляджу, што далей будзе;
Аж кінуўся ка мне,
Уеуся у самы грудзі.

Давай клеваць і рваць.
Боль вочы мне туманіць.
Каршун пье маю кроў
І грудзі мае раніць.

Праз колькі хвіль гляджу—
О, доля мая... Божа!—
То-ж не каршун ляспы,
А дзяўчынка прыгожа!

Акутала мяне
Густымі валасамі.
Апутала мяне
Пахнучымі рукамі.

А шыйка, як той сьнег,
І кругленькія шчочкі.
І як два матылькі,
Яе блакітны вочкі.

І хмеліць бяз канца
Грудзьмі, гарачым целам.
І губкамі сьсе кроў
З імпэтам апалелым.

Бязмежна была боль,
А шчасьце—надзвычайно.
Усю выпіў маю кроў
У любові дзікай, тайнай!

Бяры жыццё мае,
Прыгожая дзяўчына!
За гэткі рай на міг
Навекі я загіну.

І я увесь палаў
У віры асалодным.
Вось кончыла піць кроў
І крыкнула: «Нягодны!

«Крыві! Яшчэ крыві!
Чаму у цябе так мала?»
І кінула мяне
І каршуном зноў стала.

То быў упыр магіл
У постаці кабеты,
Што жывіцца крывёй
Людзкой на сьвеці гэтым.

Ясакар.

Рэдактар Я. Лёсік.

Новыя кніжкі.

1) **Літэратурны Зборнік**, сшыт. I. . 90
2) **Сцэнічныя творы.** Тараса Гушчы. 50
3) **Дзіцячая Чытанка** 50
4) **Матчын Дар**, зборн. верш. А. Гаруна . . . . 2рб. —
5) **Бярозка**, апаведанні Ядвігіна Ш. 75
6) **Сымон Музыка**, поэма Якуба Коласа 1рб. 50
7) **Тарас на Парнасе** 30
8) **Зборнік сцэнічных твораў**, сшыт. I. . . . . 4рб. —
9) **Першыя малітвы** 30
10) **„Вольная Беларусь“**, (у апраўе) за г. 1918 г. . . . . 6рб —
11) **Што трэба ведаць кожнаму беларусу** (зборнік артыкулаў) . . . 1 рб.

Менск. Беларуская Кнігарня.
Захар'еўская, 18.